**Пытанні да экзамену (заліку) па “Гісторыі Беларусі ”**
**(выкладчык Кавалёва Н.М.).**

1. Фармацыйны і цывілізацыйны падыходы да вывучэння гісторыі. Перыядызацыя сусветнай гісторыі.
2. Асноўныя этапы развіцця Беларусі ў кантэксце еўрапейскай і сусветнай гісторыі. Перыядызацыя курса гісторыі Беларусі.
3. Узнікненне першых цывілізацый.Антычная цывілізацыя, яе роля ў гісторыі. “Вялікае перасяленне народаў” і Беларусь.
4. Гаспадарчая дзейнасць людзей на тэрыторыі Беларусі ў першабытную эпоху. Зараджэнне і эвалюцыя прысвойваючай і вытвараючай форм гаспадаркі. Асаблівасці “неалітычнай рэвалюцыі” на Беларусі.
5. Станаўленне феадалізму ў Еўропе (у кантэксце сярэднявечнай цывілізацыі). Асноўныя рысы феадальнага спосабу вытворчасці.
6. Пачатак пераходу да класавага грамадства і ўзнікненне раннефеадальных дзяржаўных утварэнняў усходніх славян. Кіеўская Русь. Першыя княствы на беларускіх землях.
7. Утварэнне Вялікага княства Літоўскага, Рускага, Жамойцкага.
8. Эвалюцыя сацыяльна-эканамічных адносін на тэрыторыі Беларусі ў кантэксце аграрна-рамеснай цывілізацыі.
9. Барацьба за гегемонію ва Ўсходняй Еўропе. Утварэнне Рэчы Паспалітай.
10. Месца беларускіх зямель ў геапалітычнай прасторы Еўропы ў эпоху Новага часу. Войны XVI – XVIII стст. і іх наступствы.
11. Эканамічны і палітычны стан беларускіх зямель у XVII – XVIII ст. Праявы станаўлення капіталістычных адносін на беларускіх землях ў другой палове XVIII ст. у працэсе пераадолення эканамічнага заняпаду.
12. Прычыны заняпаду Рэчы Паспалітай. Падзелы Рэчы Паспалітай.
13. Фармаванне перадіндустрыяльнай цывілізацыі. Зацвярджэнне капіталізму як грамадска-эканамічнай фармацыі.
14. Расійскі шлях палітычнай мадэрнізацыі. Буржуазныя рэформы 60-70-х гадоў XIX ст., асаблівасці іх правядзення на Беларусі.
15. Разлажэнне феадалізму і зараджэнне капіталістычных адносін на беларускіх землях у першай палове XIX ст. Перадумовы і наступствы сялянскай рэформы 1861 г. на Беларусі.
16. Асаблівасці працэсу станаўлення і развіцця капіталістычных адносін у сельскай гаспадарцы Беларусі ў парэформенны час.
17. Асаблівасці працэсу станаўлення і развіцця капіталістычных адносін у прамысловасці Беларусі ў парэформенны час.
18. Эканамічнае развіццё Беларусі ў перыяд манапалістынага капіталізму. Месца эканомікі Беларусі ва ўсерасійскім рынку. Сталыпінская аграрная рэформа і асаблівасці яе здзяйснення ў Беларусі.
19. Эканамічныя і палітычныя перадумовы Першай сусветнай вайны. Пачатак Першай сусветнай вайны і акупацыя беларускай тэрыторыі.

20. Геапалітычнае становішча і сацыяльна-эканамічная сітуацыя ў Беларусі ва ўмовах Першай сусветнай вайны. Брэсцкая мірная дамова і яе ўплыў на лёс беларускага народа.
21. Лютаўская і Кастрычніцкая рэвалюцыі ў Расіі. Стратэгія і тактыка палітычных партый у адносінах да ўлады і выбары шляхоў грамадскага развіцця.
22. Паўночна-Заходні край у 1917 г. Палітычныя партыі, іх праграмы па беларускаму пытанню.
23. Абвяшчэнне БНР, яе гістарычнае месца.
24. Утварэнне БССР, яе дзяржаўна-прававы статус.
25. Геапалітычнае становішча беларускіх зямель ва ўмовах фармавання Версальска-Вашынгтонскай сістэмы.
26. Вайна Літоўска-Беларускай ССР з Польшчай. Другое абвяшчэнне БССР.
27. Палітыка “ваеннага камунізму”. Перадумовы нэпа.
28. Новая эканамічная палітыка, яе сутнасць, асаблівасці здзяйснення ў Беларусі.
29. Асаблівасці здзяйснення індустрыялізацыі ў БССР.
30. Асаблівасці здзяйснення калектывізацыі ў БССР.
31. Фармаванне адміністрацыйна-каманднай эканомікі ў БССР.
32. Грамадска-палітычнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
33. Эканамічнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
34. Нацыянальна-культурнае становішча Заходняй Беларусі ў складзе Польскай дзяржавы.
35. Пачатак Другой сусветнай вайны. Уз’яднанне Заходняй Беларусі з БССР.
36. Першыя сацыялістычныя пераўтварэнні ў Заходняй Беларусі.
37. Прычыны, характар Другой сусветнай вайны, яе асноўныя этапы.
38. Пачатак Вялікай Айчыннай вайны. Абарончыя баі на тэрыторыі Беларусі.
39. Акупацыйны рэжым у Беларусі (адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел, эканамічная палітыка, палітыка генацыда). Калабарацыянізм.
40. Асноўныя этапы станаўлення і развіцця партызанскага руху на тэрыторыі Беларусі.
41. Вызваленне Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.Вынікі вайны для беларускага народа і яго ўклад у Перамогу над фашызмам.
42. Спецыфіка сацыяльна-эканамічнага развіцця БССР ў першае пасляваеннае дзесяцігоддзе (1944 – 1954 гг).
43. Спробы эканамічных рэформаў у 1950-я – 1960-я гг. Асноўныя тэндэнцыі індустрыяльнага развіцця БССР ва ўмовах разгортвання навукова-тэхнічнай рэвалюцыі.

44. Эканоміка Беларусі ў 70-я – першай палове 80-х гадоў. Прычыны паступовага запавольвання тэмпаў эканамічнага росту і ўзнікнення цяжкасцяў у сацыяльнай сферы.
45. Змены ў сістэме міжнародных адносін на мяжы XX – XXI стст. Сутнасць стратэгіі новага палітычнага мыслення.
46. Першыя спробы перабудовы эканомікі, прычыны іх правалу (1985-1990 гг). Прычыны крызісу савецкай эканамічнай сістэмы.
47. Распад СССР. Абвяшчэнне Рэспублікі Беларусь. Утварэнне СНД.
48. Пошукі шляхоў пераходу да рыначнай эканомікі. Распрацоўка нацыянальнай стратэгіі ўстойлівага эканамічнага развіцця краіны.

**Кожны студэнт таксама павінен даваць тлумачэнне наступных паняццяў:**
гісторыя, фармацыя, цывілізацыя, антычнасць, “Вялікае перасяленне народаў”, першабытнае грамадства, прысвойваючая гаспадарка, вытвараючая гаспадарка, феадалізм, цэхавая арганізацыя рамяства, Магдэбургскае права, капіталізм, “другое выданне прыгонніцтва”, прамысловы пераварот, мануфактура, вотчынная мануфактура, манаполія, трэст, сіндыкат, буржуазная рэвалюцыя, палітычная мадэрнізацыя, індустрыялізацыя, калектывізацыя, антыгітлераўская кааліцыя, калабарацыянізм, камасацыя, асадніцтва, перабудова, новае палітычнае мышленне.

**Кожны студэнт павінен ведаць, чым вызначыліся ў гісторыі Беларусі наступныя асобы:**
Рагвалод, Рагнеда, Ефрасіння Полацкая, Кірыла Тураўскі, Міндоўг, Гедэмін, Вітаўт, Ягайла, Альгерд, Леў Сапега, Францыск Скарына, Тадэуш Касцюшка, Якуб Ясінскі, Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч, Антон і Іван Луцкевічы, Дзмітрый Жылуновіч, Аляксандр Чарвякоў, Язэп Варонка, Браніслаў Тарашкевіч, Усевалад Ігнатоўскі, Кастанцін Заслонаў, Ціхан Бумажкоў, Фёдар Паўлоўскі, Панцелеймон Панамарэнка, Кірыла Мазураў, Пётр Машэраў, Станіслаў Шушкевіч, Аляксандр Лукашэнка.

Літаратура:

1. . Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам. У 2 ч. Ч.1. Ад старажытных часоў – па люты 1917 г. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля. – Мн.: Універсітэцкае, 2000. .– 416 с.
2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 1. Са старажытных часоў да канца XVIII ст.: Курс лекцый. / І.П. Крэнь, І.І. Коўкель [і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2000. – 656 с.
3. Гісторыя Беларусі. Вучэб. дапам. У 2 ч.Ч.2. Люты 1917г.– 2000г. / пад рэд. Я.К. Новіка, Г.С. Марцуля – Мн. : Універсітэцкае, 2000.– 464 с.
4. 2. Гісторыя Беларусі: У 2 ч. Ч. 2. XIX – XX ст.: Курс лекцый / П.І. Брыгадзін., У.Ф. Ладысеў [ і інш.]. – Мн.: РІВШ БДУ, 2002.–656 с
5. История Беларуси: полный курс: учебн. пособие / А.Г. Кохановский [ и др.]. – Минск: Юнипресс, 2010.– 512 с.
6. Кавалёва Н.М., Малыхіна Л.Ю. Вывучэнне праблем эканамічнай гісторыі ў курсе “Гісторыя Беларусі”: вучэбна-метадычны дапаможнік / Агуль. рэд. Н.М. Кавалёва. – Брэст: УО “БрДТУ”, 2010. – 88 с.